# Art-mazhor 2008



XVI фестываль мастацтваў "Арт-мажор 2008" праходзіць у Мінску з 4 сакавіка па 23 мая. Арганізатарам мерапрымства традыцыйна выступае Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў і прадзюсерскі цэнтр "Арт-мажор".

У гэтым годзе фестываль праводзіцца ў межах грамадска-культурнай акцыі «Мы-беларусы!» Фестываль традыцыйна прадстаўляе штогадовую справаздачу творчых калектываў і таленавітых асоб нашай Alma Mater. У аснове ўрачыстасці ляжыць глыбокая павага да беларускіх культурных традыцый і прага да іх узнаўлення.

Святочныя канцэрты праходзяць, як у сценах нашага універсітэта, так і на іншых сталічных пляцоўках: у мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў, Маладзёжным тэатры эстрады, Доме культуры імя Ф.Э. Дзяржынскага, а таксама ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Заключны гала-канцэрт фестывалю адбудзецца ў Цэнтральным доме афіцэраў.

"Арт-мажор" – гэта жывы гук, добразычлівая атмасфера, ззянне зорак і адкрыццё новых талентаў нашага універсітэта. У межах канцэртаў увага надаецца як класічным музычным накірункам, так і авангардным, і нават эксперыментальным. Эмблема фестывалю – птушка – гэта сімвал маладосці і творчасці. Менавіта з прылётам птушак у нашым уяўленні звязаны пачатак вясны, цяпла і аднаўлення прыроды.

Урачыстае адкрыццё фестывалю мастацтваў "Арт-мажор 2008" адбылося 4 сакавіка ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Першы прарэктар БДУКМ Мікалай Кузьмініч, адкрываючы святочны канцэрт, адзначыў:

– Сёлета "Арт-мажор" праходзіць у межах акцыі "Мы – беларусы!". І таму, вітаючы наша традыцыйнае вясновае свята, мы з асаблівым пачуццём прамаўляем: "Мы – беларусы! Мы – з Беларуссю! Мы – за Беларусь!"

Дынамічная і яскравая праграма гэтага ўрачыстага вечара прыемна ўразіла сваёй разнастайнасцю. Распачаў канцэрт ансамбль ударных інструментаў "Hit pearls" пад кіраўніцтвам А. Старажука. Пад час адкрыцця беларускія народныя песні гучалі ў акапэльным выкананні ансамбляў "Гуды", "Грамніцы", "Беларуская песня", "Валачобнікі", а таксама і ў суправаджэнні старажытных музычных інструментаў Беларусі. Сапраўдным гаспадаром вечара стаў лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў Маладзёжны эстрадна-сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам В. Валатковіча. Можна было пабачыць і нязвыклыя сучаснаму воку народныя танцы, і бальны танец, пачуць класічныя музычныя творы і выдатную апрацоўку блюзавых кампазіцый. Уладзімір Угольнік парадаваў гледачоў аўтарскім выкананнем нумароў "Янка-жартаўнік" і "Рок-н-рол".

Такім чынам, атрымаўся сапраўды мажорны, шчодры вечар. Завяршыўся канцэрт песняй-гімнам "Універсітэт" у выкананні ансамбля "Universum" (мастацкі кіраўнік Т. Дробышава), якую падхапілі ўсе ўдзельнікі канцэрта.



# АРТ-МАЖОР 2008: ХРОНІКА ПАДЗЕЙ



Адметнай рысай сёлетняга фестывалю “Арт-мажор” стала жаданне прадэманстраваць дзейнасць усіх кафедраў нашага універсітэта. З гэтай нагоды ў фестывальную праграму былі ўключаны Дні факультэтаў. У першыню адбыўся конкурс-канцэрт скрыпічнай джазавай імправізацыі. Старшынёй журы быў прызначаны Уладзімір Угольнік.

Адкрыўся вечар знакамітым творам А. Вівальдзі “Зіма” з цыкла “Поры года” ў выкананні Камернага ансамбля (сола – Н. Давыдава).



У конкурсную праграму ўвайшлі творы такіх выдатных кампазітараў, як Дж. Гершвін, С. Грыднер, С.Целяпнёў, Р.Джанга, Р.Картэр, Р.Бацылін і інш. Гучалі музычныя творы папулярнага зараз А. П`яцола. Завяршыўся вечар прыгожай кампазіцыяй Р. Уільямса “Спіс Шындлера” ў выкананні Камернага ансамбля (сола – Н. Руцкая).

Напрыканцы конкурса У. Угольнік аб’явіў імёны пераможцаў: 3-е месца заняла Н. Давыдава, 2-е – Я. Міхайлік, 1-е – Н. Руцкая. Гран-пры конкурса атрымала Н.Коўган (кампазіцыя Softly “Сонечная раніца” ).

Прынамсі, вечар насіў камерны характар, які, тым не менш, спрыяў стварэнню ў зале пэўнага настрою для ўспрымання музыкі і добрага энергетычнага запалу.



Наступны этап фестывалю – канцэрт кафедры народна-інструментальнай творчасці – прайшоў у клубе імя Ф.Э Дзяржынскага.

На суд слухачоў вынеслі свае лепшыя кампазіцыі гурт старажытнай беларускай музыкі і Беларускі аркестр народных інструментаў. Са сцэны ліліся гукі “Думкі пра Палессе” І. Укражэнкі, “Мазурка” С. Манюшкі ў выкананні аркестра В. Валатковіча і іншыя вядомыя і любыя ўсім сапраўдным меламанам мелодыі. Добрыя і шчырыя ўсмешкі гледачоў выклікала трыо балалаек. Авацыі сарвалі ў зале трыо баяністаў з аўтарскім творам “Інтэрмедыя” Глубачэнкі. Удзел у святочным канцэрце таксама прынялі: ансамбль народнай інструментальнай творчасці пад кіраўніцтвам Г. Мішурова, які, дарэчы, віртуозна выканаў твор Астра П`яцолы; фальклорны ансамбль “Баламуты”, які парадаваў слых гледачоў балгарскімі матывамі (“Балгарская сюіта”); “Караван аркестр” выканаў канцэрт “Фантазія”; а ансамбль акардыяністаў “Туцці” пад кіраўніцтвам Лідзіі Сухаваравай, як кажуць, “парваў залу”. Завяршылася ўрачыстасць творам “Старагародская сюіта” у выкананні рускага народнага інструментальнага аркестра пад кіраўніцтвам С. Авадка.

Па настроі гледачоў і іх уражаннях, якія выказваліся пасля канцэрта было зразумела – свята адбылося! Музыкі здолелі дасягнуць той глыбіні, якая абуджае сапраўдны народны дух і падараваць усім прыхільнікам народнай музыкі, якія наведалі канцэрт, агеньчык свайго творчага запалу і выдатнага настрою.

# АРТ-МАЖОР 2008: ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Сёлетні фестываль уключыў у сябе яшчэ адно наваўвядзенне – Рэспубліканскую практычную канферэнцыю па фальклоры, у межах якой праходзіў шэраг мерапрыемстваў: канцэрт фальклору беларускай глыбінкі, майстар-класы ад беларускіх, расійскіх, польскіх і латвійскіх носьбітаў фальклору. Завяршылася гэта надзвычай пазнавальнае мерапрыемства 28 сакавіка ўрачыстым канцэртам перайманьнікаў традыцый "Агу, вясна!", які адбыўся ў Маладзёжным тэатры эстрады. Дарэчы, гэты канцэрт быў прымеркаваны да 5-годдзя факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУКМ.

Распачаўся канцэрт выхадам на сцэну адразу трох гуртоў – "Гуды", "Талака" і "Этнаграфічная суполка" – якія выканалі прыгожы і моцны музычны нумар "Зямля Беларусі". Праграма ўрачыстасці была насычана танцавальнымі нумарамі, беларускімі валачобнымі песнямі, вясельнымі спевамі. Выступалі беларускія народныя вакальныя і інструментальныя ансамблі "Гуды", "Кроса", "Кудзьмень". Вечар вяла Наталля Матыліцкая, выкладчык кафедры этнаграфіі і фальклору БДУКМ, мастацкі кіраўнік аднаго з гуртоў – удзельнікаў канцэртнай праграмы.

Акрамя беларускіх майстроў фальклорнай песні на канцэрт завіталі і суседзі з бліжняга замежжа – Латвіі, Польшчы, але асаблівую сімпатыю гледачоў здабыў расіянін Сяргей Старасцін.

У фінале на сцэну выйшлі ўсе ўдзельнікі мерапрыемства і разам выканалі на развітанне песню "Агу, вясна!" Трэба дадаць, што ўсе ўдзельнікі святочнай імпрэзы атрымалі ганаровыя дыпломы і пацвердзілі статус перайманьнікаў народных традыцый і фальклору.






Наступным мерапрыемствам у межах "Арт-мажора" стаў адзін з самых відовішчных канцэртаў фестывалю – справаздача кафедры мастацтва эстрады.

Пачаўшыся выступленнем ударных інструментаў, канцэрт хутка набыў імклівы тэмп і задорнае гучанне. Многія ансамблі і салісты, якія прынялі ўдзел у канцэрце, выступалі разам з Маладзёжным эстрадана-сімфанічным аркестрам пад кіраўніцтвам Віктара Валатковіча. Сярод выступоўцаў – ансамблі пад кіраўніцтвам М. Бялова (салісты Н. Коўган і Р. Раманаў), С. Папова (салісты Н. Давыдава і А. Мінкоў), У. Бялова. Ансамблі "Джаз стандарт" і "Універсум" выконвалі разнастайныя апрацоўкі беларускіх народных песен. Гучалі творы ў выкананні саксафанічнага ансамбля "Хорус" і ўдарнага ансамбля "Звар'яцелая армія". Адразу трыма прэм'ерамі – "Прэлюдыя", "Іспанская фантазія" і "Дождж у лютым" – уразіў слухачоў Уладзімір Угольнік. Сольна выступалі Г. Благава з аўтарскім творам "Малітва", Ю. Астапенка з песняй "З ранку да ночы" і іншыя.

Ідэйным завяршэннем вечара сталі песні "Мы – беларусы" і гімн "Універсітэт". Для ўсіх удзельнікаў канцэрта гэтае свята стала своеасаблівым падсумаваннем доўгай і плённай працы. Я абсалютна ўпэўнена, што гучныя і шчырыя апладысменты гледачоў сталі найвышэйшай адзнакай для таленавітых прадстаўнікоў кафедры мастацтва эстрады нашай Alma mater.

**На фотаздымках фестывальныя моманты.**
**Матэрыялы падрыхтавалі**
**Вольга ГАБРУСЬ (тэкст) і Сяргей ГАПОН (фота)**